УДК 930(476)«1850/19»-028.79

П. С. Кручак, дацэнт

# ЛІБЕРАЛЬНЫ НАКІРУНАК У БЕЛАРУСКАЙ ГІСТАРЫЯГРАФІІ Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XIX – ПАЧАТКУ XX СТСТ.

The article dwells upon the process of formation of Belarusian historic science at the end of the XIX and the beggining of the XX centuries. These were three directions in Belarusian historiography – official-clerical, liberal and national-democratic. It was the representatives of the liberal direction who scientifically refuted the oficial-clerical conception of history of Belarus and laid the basis for formation of an national-democratic direction in Belarusian historiography.

**Уводзіны.** Другая палова XIX – пачатак XX стст. – гэта перыяд станаўлення беларускай гістарычнай навукі. Беларуская гістарыяграфія ў гэты час развівалася ў цеснай сувязі з этнаграфіяй, філалогіяй і фалькларыстыкай. Дзякуючы дзейнасці такіх вядомых этнографаў, як П. Шэйн, Я. Раманаў, М. Доўнар-Запольскі, і некаторых іншых расійскае грамадства ўпершыню пазнаёмілася з Беларуссю, з асаблівасцямі матэрыяльнай і духоўнай культуры беларусаў.

Да гэтага часу вывучэннем мінулага Беларусі займаліся ў асноўным польскія гісторыкі, якія разглядалі яе ў рэчышчы польскай гісторыі. Да сярэдзіны XIX ст. расійскія вучоныя на гісторыю Беларусі ўвагі звярталі вельмі мала.

Сітуацыя змянілася пасля падаўлення паўстання 1863–1864 гг., калі царскі ўрад узяў курс на ўзмацненне палітыкі русіфікацыі. Для дасягнення гэтай мэты былі мабілізаваны ўсе адміністрацыйныя, матэрыяльныя і навуковыя рэсурсы. Перад навукоўцамі была пастаўлена задача абгрунтавана даказаць, што Паўночна-Заходні край з'яўляецца спрадвечна рускім, а беларусы – гэта састаўная частка адзінага рускага племені, толькі сапсаваныя польскім уплывам. У такіх складаных умовах і адбывалася станаўленне беларускай гістарычнай навукі.

У беларускай гістарыяграфіі дадзенага перыяду можна вызначыць тры асноўных накірункі – афіцыйна-клерыкальны, ліберальны і нацыянальна-дэмакратычны. Прадстаўнікі першага з іх наогул не прызнавалі існавання самастойнага беларускага этнасу. Усю гісторыю Беларусі да канца XVIII ст. яны разглядалі як перыяд цемры і масавай паланізацыі. І цяпер, пасля ўз'яднання з Расіяй, беларусы, на іх думку, павінны як мага хутчэй зліцца з брацкім рускім народам. Прадстаўнікі нацыянальна-дэмакратычнага накірунку, наадварот, адстойвалі самабытнасць беларускага народа і яго права на нацыянальнае самавызначэнне. Прадстаўнікі ліберальнага накірунку займалі ў гэтых пытаннях больш памяркоўныя пазіцыі.

**Асноўная частка.** Трэба адзначыць, што ліберальны накірунак у беларускай гістарыяграфіі прадстаўлены менш ярка. Гэта было звязана перш за ўсё з тым, што ў Беларусі адсутнічалі свае навуковыя і універсітэцкія цэнтры, у якіх і пераважае, у асноўным, ліберальная інтэлігенцыя. Таму большая частка беларускіх гісторыкаў была вымушана працаваць за межамі краю – ва універсітэцкіх цэнтрах Расійскай імперыі. Сярод такіх вучоных ліберальнага накірунку можна назваць перш за ўсё ўраджэнцаў Беларусі Я. Ф. Карскага і І. І. Лапа, а таксама ўраджэнца Расіі, які плённа працаваў на ніве вывучэння мінулага Беларусі, М. К. Любаўскага. Навуковая дзейнасць гэтых вучоных адбывалася ў вельмі неспрыяльных умовах. Афіцыйныя ўлады Расійскай імперыі не прызнавалі існавання самастойнага беларускага этнасу са сваімі моўнымі і культурнымі асаблівасцямі, адмаўлялі беларусам не толькі ў праве на гістарычную будычыню, але і ў існаванні ў іх самабытнага гістарычнага мінулага. У гэтых умовах працы беларускіх ліберальных гісторыкаў мелі асаблівую каштоўнасць.

Я. Ф. Карскі вядомы перш за ўсё як выдатны лінгвіст і заснавальнік беларускага мовазнаўства. Найбольш плённы перыяд яго навуковай дзейнасці прыйшоўся на час працы вучонага ў сценах Варшаўскага універсітэта. Тым не менш, яго шматгранная навуковая дзейнасць мела вялікае значэнне для фарміравання гістарычнай самасвядомасці беларускай нацыі. Актыўная творчая дзейнасць вучонага прыйшлася на той перыяд, калі ў нашай гістарычнай навуцы панавала канцэпцыя «заходнерусізму». У гэтых умовах з'яўленне даследаванняў Я. Карскага, у якіх на аснове грунтоўных навуковых падыходаў раскрывалася самабытнасць беларускага этнасу, паказвалася яго моўная і культурная сваеасаблівасць, мела вялікую значымасць.

Першай у гэтым сэнсе значнай працай вучонага з'явілася даследаванне «Обзор звуков и форм белорусской речи». Праца была напісана на аснове параўнаўчага аналізу старадаўніх літаратурных і гістарычных крыніц з жывой гутарковай беларускай мовай. Асабліва каштоўным было тое, што аўтар выкарыстоўваў шматлікія неапублікаваныя старадаўнія рукапісы. Усё гэта дазволіла яму зрабіць выснову, што сучасная беларуская мова мае цесныя сувязі з мовай старадаўніх беларускіх літаратурных помнікаў [1, с. 212].

Грунтоўныя гісторыка-філалагічныя даследаванні дазволілі Я. Карскаму звярнуцца да

вырашэння праблемы этнагенэзу беларускага народа. Асаблівае месца ў гэтым сэнсе займае трохтомная праца Я. Карскага «Белорусы» – фундаментальнае даследаванне па гісторыі беларускай мовы і літаратуры. Гэта праца базіравалася на вялікай колькасці пісьмовых і этнаграфічных крыніц, большую частку з якіх вучоны сабраў пад час фальклорных і этнаграфічных экспедыцый па Беларусі і Літве. Гэта дало яму магчымасць дакладна вызначыць тэрытарыяльныя межы распаўсюджвання беларускай мовы, што ў сваю чаргу дазволіла скласці карту рассялення беларускага этнасу. Упершыню такая карта была надрукавана ў 1917 г.

У пешым томе «Белорусов» Я. Карскі прыходзіць да высновы, што ўжо к XIV ст. са старажытнарускіх плямён крывічоў, дрыгавічоў і радзімічаў сфарміравалася беларуская народнасць [2, с. 112]. Гэта выснова, зробленая на базе вялікай колькасці фактаў, мела не толькі навуковае значэнне. Яна з'ўлялася сваеасаблівым навуковым падмуркам пад імкненнем беларускай інтэлегенцыі разгарнуць барацьбу за нацыянальнае адраджэнне.

Трэба адзначыць, што Я. Карскі не абмяжоўваўся толькі навуковым абгрунтаваннем праблем беларусазнаўства. Ён сам з'яўляўся актыўным удзельнікам беларускага нацыянальна-культурнага руху. Вучоны вёў актыўную перапіску з такімі вядомымі беларускімі вучонымі і грамадскімі дзеячамі, як М. Доўнар-Запольскі, П. Шэйн, М. Нікіфароўскі, Е. Раманаў, В. Ластоўскі, Я. Лёсік, Ф. Турук і інш. У 1917 г. Я. Карскі з'яўляўся ўдзельнікам і ганаровым старшынёй першага ўсебеларускага з'езда, на якім прадстаўнікі беларускага народа ўпершыню ў гісторыі паспрабавалі самастойна вырашыць свой далейшы лёс.

Такім чынам, навуковыя працы Я. Карскага, яго грамадская і культурна-асветніцкая дзейнасць з'явіліся значным фактарам развіцця нацыянальнай самасвядомасці беларусаў і іх нацыянальнай культуры ў другой палове XIX – пачатку XX стст.

Другі відны прадстаўнік беларускай ліберальнай гістарыяграфіі І. І. Лапа большую частку сваёй навуковай дзейнасці правёў у Юр'еўскім універсітэце. Яго асноўныя працы былі прысвечаны даследаванню сацыяльна-палітычнай гісторыі Вялікага княства Літоўскага ў XVI ст., яго дзяржаўных устаноў і сацыяльнай структуры грамадства. Вялікую ўвагу вучоны ўдзяляў крыніцазнаўчаму аналізу Літоўскай Метрыкі, у якой былі сабраны важнейшыя дакументы вялікакняжаскай канцэлярыі.

Прааналізаваўшы шматлікія гістарычныя крыніцы, І. Лапа прыйшоў да высновы, што і пасля заключэння Люблінскай уніі беларуска-літоўскія землі захоўвалі сваю адасобленнасць ад Польшы, і перш за ўсё ў праваых адносінах [3, с. 228].

Вялікую ўвагу І. Лапа ўдзяляў аналізу сацыяльнай структуры ВКЛ, і ў першую чаргу сацыяльна-палітычнаму становішчу шляхецкага саслоўя. Пры гэтым ён вывучаў сацыяльную структуру ВКЛ не толькі на агульнадзяржаўным узроўні, але і спрабаваў аналізаваць яе рэгіянальныя асаблівасці. Усё гэта рабілася для больш поўнага разумення ролі ўсходнеславянскага элемента ў гісторыі польскай дзяржавы.

Вельмі моцны ўдар па «заходнерусісцкай» версіі гісторыі ВКЛ нанеслі працы расійскага ліберальнага гісторыка М. К. Любаўскага. Найбольшую цікавасць выклікаюць дзве яго працы – «Очерки истории Литовско-русского государства до Люблинской унии включительно» і «Основные моменты истории Белоруссии». Гісторык выдзяляе 4 перыяды у беларускай гісторыі: 1. Кіеўскі (IX–XII стст.); 2. Літоўскі (XIII – сяр. XVI стст.); 3. Польска-літоўскі (другая палова XVI–XVIII стст.); 4. Рускі (XIX – пач. XX стст.). Як бачна, за крытэрый сваёй перыядызацыі гісторык узяў фактар уваходжання беларускіх зямель у склад той ці іншай дзяржавы.

Першы перыяд беларускай гісторыі разглядаўся М. Любаўскім вельмі схематычна. Родапачынальнікам беларусаў вучоны лічыў усходнеславянскае племя крывічоў, якое насяляла басейны З. Дзвіны і вярхоўе Дняпра. Зачаткі беларускай дзяржаўнасці гісторык бачыў у Полацкім княстве. Ён адзначаў, што полацкія князі заўжды з'ўляліся заклятымі ворагамі Кіева і імкнуліся да поўнай незалежнасці ад яго. Вытокі гэтага сепаратызму М. Любаўскі бачыў у настроях самаго насельніцтва Полацкай зямлі, якое мела свае ўласныя эканамічныя і гандлёвыя інтарэсы і не жадала лічыцца з інтарэсамі астатняй Русі [4, с. 23].

Асноўную ўвагу М. Любаўскі ўдзяляў даследаванню гісторыі Вялікага княства Літоўскага. На думку вучонага, ВКЛ з'ўлялася дзяржавай не проста літоўскай, а літоўска-рускай. Пры гэтым пад тэрмінам «рускі» вучоны разумеў той славянскі элемент, які насяляў тэрыторыю сучаснай Беларусі і Украіны і ў далейшым з'явіўся асновай для фарміравання беларускай і ўкраінскай народнасцяў [5, с. 1].

М. Любаўскі падкрэсліваў, што гісторыя ВКЛ з'ўлялася непасрэдным працягам гісторыі Кіеўскай Русі, бо літоўска-руская дзяржава захавала значна больш традыцый і рыс Кіеўскага перыяду, чым Русь Уладзіміра-Суздальская, якая будавала сваё жыццё на новых пачатках, што склаліся пад уплывам мангола-татарскага нашэсця.

М. Любаўскі прапанаваў сваю канцэпцыю ўтварэння ВКЛ. Ён лічыў, што беларускія землі ўключаліся ў склад новай дзяржавы рознымі шляхамі. Адны з іх былі заваёваны літоўцамі, другія далучыліся дабраахвотна на

дагаворнай аснове. Гэта прывяло да ўсталявання ў дзяржаве фактычна федэратыўнага ладу. Напрыклад, Полацкая і Віцебская землі доўгі час захоўвалі вялікую самастойнасць. У новай дзяржаве панавалі «рускія» законы, «рускія» парадкі і «руская» мова. У якасці галоўнай прычыны ўтварэння ВКЛ М. Любаўскі бачыў знешнюю пагрозу з боку крыжакоў і мангола-татар. Гісторык разглядаў утварэнне ВКЛ як своеасаблівую рэстаўрацыю былой Кіеўскай дзяржавы, узнаўленне парушанага адзінства. Як збіральніца рускіх зямель ВКЛ больш чым на сто гадоў апярэдзіла Маскоўскую дзяржаву [5, с. 37]. Такія высновы поўнасцю аправерагалі погляды афіцыйных расійскіх гісторыкаў, якія сцвярджалі, што толькі Маскоўская дзяржава стала законным спадкаемцам традыцый Кіеўскай Русі.

Аналізуючы сацыяльна-палітычныя сістэмы ВКЛ і Маскоўскай дзяржавы, М. Любаўскі прыйшоў да высновы, што яны развіваліся ў супрацьлеглых накірунках. Маскоўская дзяржава фарміравалася ў напрамку манархічнага абсалютызму і адміністрацыйнага цэнтралізму. У выніку яна набыла форму спадчыннай і неабмежаванай манархіі з моцным цэнтральным апаратам. ВКЛ у сваю чаргу развівалася ў напрамку канстытуцыяналізму і федэралізму. Яго палітычная сістэма набыла форму выбарчай манархіі, абмежаванай Радай і Сеймам. Пры гэтым мясцовае кіраванне адыгрывала ў ВКЛ значную ролю і мела рысы аўтаноміі. Такая сітуацыя замацоўвалася прывілеямі, якія давала месцам вялікакняжацкая ўлада.

М. Любаўскі паспрабаваў даць адказ на пытанне: чыёй дзяржавай з'яўлялася Вялікае княства Літоўскае, Рускае і Жамойцкае? Ён выступіў супраць канцэпцыі так званай «літоўскай дзяржаўнасці», якая даказвала прыярытэт літоўскіх феадалаў у ВКЛ. Гісторык падкрэсліваў, што гэта пытанне трэба разглядаць у дынаміцы. На першым этапе станаўлення палітычнай сістэмы ВКЛ вядучую ролю адыгрываў славянскі элемент. Потым, пасля Крэўскай уніі, дамінаваць пачынаюць літоўска-каталіцкія паны і баяры. Аднак у выніку напружанай барацьбы на працягу XV–XVI стст. беларуска-ўкраінская частка феадалаў праваслаўнага і пратэнстанцкага веравызначэння дабіваецца палітычнага парытэту. Дзяржаўная ўлада з гэтага часу больш-менш прапарцыянальна размяркоўваецца паміж магнатамі і шляхтай славянскага і балцкага паходжання. Таму і дзяржаву М. Любаўскі называў літоўска-рускай.

Палітычную гісторыю ВКЛ XV–XVI стст. М. Любаўскі падзяляў на два перыяды. Першы (40-я гг. XV – 40-я гг. XVI стст.) – час княжання Казіміра і яго сыноў. Вядучая палітычная роля ў грамадстве ў гэты перыяд належыла беларуска-літоўскай арыстакратыі – князям і панам. Шляхта адыгрывала другасную ролю. Другі перыяд – час вялікага княжання Сігізмунда-Аўгуста (1548–1572). Шляхта ў гэты час дабіваецца роўных правоў, перапрацоўвае заканадаўства, дзякуючы чаму палітычны лад ВКЛ набліжаецца да польскага. Каб замацаваць такое становішча, шляхта ставіць пытанне аб уніі з Польшчай. Люблінская унія 1569 г., на думку М. Любаўскага, паклала канец самастойнаму існаванню літоўска-рускай дзяржавы. Пачаўся перыяд паланізацыі беларускага краю, які ў XIX ст., пасля ўключэння беларускіх зямель у склад Расійскай імперыі, змяніўся палітыкай русіфікацыі. Але вывучэнню трэцяга і чацвёртага перыядаў беларускай гісторыі М. Любаўскі спецыяльнай увагі не ўдзяляў.

Грунтоўныя працы М. Любаўскага аказалі ў далейшым вялікі ўплыў на погляды пазнейшых беларускіх гісторыкаў, і ў першую чаргу на погляды яго вучня У. І. Пічэты.

**Заключэнне.** Канечне, уплыў беларускіх гісторыкаў ліберальнга накірунку на развіццё беларускай гістарыяграфіі нельга параўнаць з тым уплывам, які аказалі на фарміравнне сваіх нацыянальных гістарыяграфій рускія і ўкраінскія ліберальныя гісторыкі. Гэта было звязана з аб'ектыўнымі абставінамі – адсутнасць уласных універсітэцкіх і акадэмічных цэнтраў, неспрыяльная, а часам і рэпрэсіўная палітыка царскіх улад, якая асабліва ўзмацнілася пасля падаўлення паўстання 1863–1864 гг., незавершанасць працэсу фарміравання беларускай нацыі. Тым не менш, у працах Я. Карскага, І. Лапа, М. Любаўскага і некаторых іншых даследчыкаў ліберальнага накірунку была амаль што ўпершыню аправергнута афіцыйна-клерыкальная канцэпцыя гісторыі Беларусі. Тым самым яны заложылі падмурак для фарміравання нацыянальна-дэмакратычнага накірунку ў беларускай гістарыяграфіі.

## Літаратура

1. Карев, Д. В. Белорусская и украинская историография к. XVIII – н. XX стст. / Д. В. Карев. – Вильнюс: ЕГУ, 2007.
2. Карский, Е. Ф. Белорусы. Введение в изучение языка и народной словесности: в 3 т. / Е. Ф. Карский. – Варшава, 1903. – Т. 1.
3. Лаппо, И. И. Великое княжество Литовское за время от заключения Люблинской унии до смерти Стефана Батория. 1569–1586 / И. И. Лаппо. – СПб., 1901.
4. Любавский, М. К. Основные моменты истории Белоруссии / М. К. Любавский. – М., 1918. – С. 23.
5. Любавский, М. К. Очерки истории литовско-русского государства до Люблинской унии включительно / М. К. Любавский. – М., 1915.